скими захватчиками в годы Великой Отечественной войны [Электронный ресурс] // Советская Беларусь сегодня. – Режим доступа: https://www.sb.by/articles/bez-sroka-davnosti435345.html. – Дата доступа: 02.02.2022.

5. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Лунінецкага раёна / укл. Т. В. Канапацкая. – Мінск : Беларусь, 1995. – 716 с.

**К. В. НАХАЙЧУК**
Навуковы кіраўнік – П. С. Рамановіч

## АДУКАЦЫЙНЫ ПЕРЫЯД У ЖЫЦЦІ НАПАЛЕОНА ОРДЫ

Берасцейская зямля ганарыцца многімі сынамі, у тым ліку і Напалеонам Ордам (1807–1883). Напалеон Орда – кампазітар, мастак, публіцыст, грамадскі і культурны дзеяч, якога шануюць не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах Еўропы.

Нарадзіўся Напалеон Орда 11 лютага 1807 г. у дваранскай сям'і, якая жыла ў радавым маёнтку Чырвоны Двор паблізу Варацэвіч Пінскага павета (цяпер Іванаўскі раён Брэсцкай вобласці). Бацька Напалеона Орды з'яўляўся маршалкам шляхты Кобрынскага павета. Будучы мастак рана (у два гады) страціў бацьку.

Першапачатковую адукацыю Напалеон Орда атрымаў у бацькоўскім доме ў Варацэвічах. Вялікі ўплыў на яго аказала маці Юзэфіна Бутрымовіч – дачка пінскага старасты Мацея Бутрымовіча. Маці была таленавітай піяністкай, таму ён рана стаў музыцыравацц. У дзяцінстве выявілася таксама здольнасць да малявання.

У 12-гадовым узросце сын быў адпраўлены маці ў Свіслацкую гімназію, якая была заснавана ў 1804 г. для навучання моладзі з Брэсцкага, Пружанскага, Кобрынскага, Слонімскага, Ваўкавыскага і Гродзенскага паветаў. У гімназіі меліся шэсць асноўных класаў, у якіх займаліся каля 300 вучняў [1, с. 235]. Выкладаліся польская, грэчаская, нямецкая, французская мовы, латынь, арыфметыка, алгебра, фізіка, геаметрыя, трагонаметрыя, прыродазнаўства, архітэктура, хімія, права, палітэканомія, каліграфія, гісторыя, міфалогія, касмаграфія, садоўніцтва, батаніка, сельская гаспадарка, мінералогія, мараль, логіка, рыторыка, эстэтыка, маляванне, музыка, гімнастыка [2, с. 22–23]. Сучаснікі лічылі Свіслацкую гімназію адной з найлепшых устаноў Літвы.

З 1819 г. у гімназіі пачалі стварацца гурткі, удзельнікі якіх увайшлі ў тайную арганізацыю "Таварыства аматараў навук", заснаваную ў 1820 г. Напалеон Орда ўступіў у тайнае таварыства "Заране", створанае ў Беластоцкай і Свіслацкай гімназіях. "Заране" марылі пра незалежнасць зямель Рэчы Паспалітай, адкрыта выказвалі пратэст супраць нацыянальнай

Рэпазіторый БрДУ

палітыкі царызму. Яны імкнуліся да высокаадукаванага і маральнага грамадства. Дзейнасцю "Заран" заняўся спецыяльны следчы камітэт, былі прыняты меры тлумачальнага характару. Атрымаўшы дыплом, 17-гадовы Напалеон Орда прыехаў у Варацэвічы. Ён пачаў падрыхтоўку да паступлення ў Віленскі ўніверсітэт.

У 1803 г. галоўная Віленская школа была рэарганізавана ва ўніверсітэт з чатырма факультэтамі: маральных і палітычных навук, фізіка-матэматычным, медыцынскім, літаратурным і вольных мастацтваў. Пры ўніверсітэце дзейнічалі медыцынскі, ветэрынарны, аграномічны інстытуты, абсерваторыя, адзін з самых багатых у Еўропе батанічных садоў, найбагацейшая бібліятэка. Універсітэт быў цэнтрам перадавой навукі і грамадскай думкі.

У 1823 г. Напалеон Орда паспяхова вытрымаў іспыты прыёмнай камісіі і стаў студэнтам фізіка-матэматычнага аддзялення Віленскага ўніверсітэта. Напалеон Орда апынуўся ў цэнтры перадавой думкі. Ва ўніверсітэце ў 1817 г. было ўтворана тайнае студэнцкае таварыства філаматаў (сяброў навукі). Сярод арганізатараў таварыства былі А. Міцкевіч, Т. Зан, Я. Чачот, Ф. Малеўскі і інш. Пад уплывам польскага нацыянальна-вызваленчага руху студэнты марылі аб незалежнасці Рэчы Паспалітай, распаўсюджвалі антысамадзяржаўныя і антыфеадальныя ідэі.

Напалеон Орда ва ўніверсітэце апынуўся ў гушчы студэнцкага руху. Міністэрства ўнутраных спраў Расіі атрымлівала шматлікія данясенні пра нарастанне студэнцкіх хваляванняў. У ліпені 1826 г. Напалеон Орда з дзесяццю сябрамі па вучобе быў арыштаваны і выключаны з універсітэта. Ён трапіў у Віленскую турму, у якой знаходзіўся адзін год і тры месяцы. Напрыканцы 1927 г. Орда быў вызвалены з турмы і вярнуўся ў родныя Варацэвічы. Ён працягваў самаадукацыю, спрабаваў працягваць вучобу ва ўніверсітэце. Але дзверы ўніверсітэта зачыніліся перад ім назаўсёды. Напрыканцы 1829 г. яго залічылі ў расійскую армію.

Напалеон Орда падтрымліваў нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1830–1831 гг. Ён напісаў і прылюдна агучыў палымяны верш "Ліцвін да паляка", прысвечаны паўстанню. Трэцяя частка студэнтаў Віленскага ўніверсітэта ўдзельнічала ў паўстанні 1830–1831 гг., за што распараджэннем імператар Мікалай I у 1832 г. закрыў універсітэт [3, с. 168].

Напалеон Орда пад чужым імем праз Аўстрыю, Італію, Швейцарыю дабіраецца ў Парыж. Рэвалюцыйная Францыя станоўча ставілася да выгнаннікаў з краін, дзе адбываліся нацыянальна-вызваленчыя паўстанні. У 1833 г. урад Францыі дазволіў былым студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, у тым ліку Віленскага ўніверсітэта, працягваць навучанне ў Францыі. Студэнты-эмігранты аднавілі вучобу пераважна ва ўніверсітэтах Парыжа, Манпелье, Страсбурга [2, с. 109].

Рэпазіторый БрДУ

Ад'язджаючы ў эміграцыю, Напалеон Орда не меў яшчэ завершанай мастацкай адукацыі. Галоўнай мэтай для яго ў Парыжы стала вучоба. Напалеон Орда пачаў праяўляць асаблівую цікавасць да выяўленчага мастацтва. У Парыжы дзейнічалі цэлыя школы пейзажыстаў. Аднойчы Орда паказаў невялікія замалёўкі Ф. Шапэну, які прапанаваў яму наведаць студыю мастака-пейзажыста П'ера Жырада. Напалеон Орда авалодаў майстэрствам рысавальшчыка.

У 1834–1835 гг. Напалеон Орда сустрэўся з кампазітарам Ферэнцам Лістам. Апошні ўважліва праслухаў творы беларускага эмігранта і станоўча ацаніў ягонае майстэрства. У хуткім часе Орда спраўдзіў спадзяванні сусветна вядомага музыканта і кампазітара.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1996–2004. – Т. 4 : Варанецкі – Гальфстрым. – 1997. – 480 с.

2. Несцярчук, Л. М. Напалеон Орда. Шлях да Бацькаўшчыны : кніга-альбом / Л. М. Несцярчук. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 430 с.

3. Палубінскі, А. Свіслацкая гімназія / А. Палубінскі // Памяць. Свіслацкі раён. – Мінск : Беларусь, 2004. – 525 с.

**Ю. А. НИКОНЮК**
Научный руководитель – Т. П. Савчук

## ХОЛОКОСТ В ГОРОДЕ БРЕСТЕ В ГОДЫ ВЕЛИКОЙ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ ВОЙНЫ

Холокост – это всемирная трагедия полного уничтожения еврейского населения в годы Великой Отечественной войны, которое осуществлялось гитлеровской Германией и ее союзниками. Они поставили перед собой цель – стереть с лица земли евреев как нацию. Люди этой национальности уничтожались поголовно – от пожилых людей до детей – без суда и следствия. И все это происходило лишь потому, что они были евреями.

Еврейская община в Бресте считается самой древней в Беларуси. Брест же был первым городом СССР, почти полностью взятым гитлеровцами в ночь с 21 на 22 июня 1941 г. До войны в городе проживало около 50 тыс. человек, 25 тыс. из них – евреи [1].

После захвата города положение еврейского населения стало невыносимым. Все имущество, что принадлежало евреям, было немедленно объявлено собственностью рейха. Местные жители до 15 января 1942 г. должны были заявить в немецком кредитном бюро о наличии золота

Репозиторий БрГУ